**Ляйко Н.А.,** *дацэнт*

# СТАН І ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ БІБЛІЯТЭК, ЯКІЯ АБСЛУГОЎВАЮЦЬ ДЗЯЦЕЙ

У нашай краіне дзяцей і падлеткаў абслугоўваюць бібліятэкі розных тыпаў: абласныя, публічныя, дзіцячыя, школьныя. Гэта

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гарантавана законам «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь». У главе III, арт. 10 падкрэсліваецца, што «дзеці і падлеткі маюць права на бібліятэчнае абслугоўванне ў агульна-даступных бібліятэках, спецыя-лізаваных дзяржаўных дзіцячых бібліятэках, а таксама праз сетку бібліятэк агульна-адукацыйных, прафесійна-тэхнічных навучальных і пазашкольных устаноў». Па даных Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, на сучасным этапе ў Рэспубліцы Беларусь дзяцей і падлеткаў абслугоўваюць 6 абласных бібліятэк, звыш 5000 публічных, каля 5000 школьных, звыш 280 самастойных дзіцячых бібліятэк. На жаль, трэба адзначыць, што ва ўмовах рынку з кожным годам колькасць самастойных бібліятэк, якія абслугоўваюць дзяцей і падлеткаў, змяншаецца. У прыватнасці, гэта датычыцца аб'яднання абласных бібліятэк, скарачэння самастойных дзіцячых, а таксама (з 1992 г.) школьных бібліятэк у сельскай мясцовасці.

Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 12.07.95 N 267п-В прадпісвае ажыццяўляць аб'яднанне бібліятэчнай сеткі Міністэрства адукацыі і Міністэрства культуры з мэтай скарачэння бюджэтных сродкаў на яе ўтрыманне.

З мэтай выяўлення эканамічнага эфекту ад аб'яднання сельскіх і школьных бібліятэк на працягу 1992-1995 гг. праводзіўся эксперымент у 6 раёнах трох абласцей: Баранавіцкім і Івацэвіцкім Брэсцкай вобласці, Горацкім Магілёўскай вобласці, Барысаўскім, Салігорскім, Слуцкім Мінскай вобласці — усяго ў 31 населеным пункце. У асноўным аб'яднанне ажыццяўлялася ў тых населеных пунктах, дзе існуюць малакамплектныя школы з колькасцю вучняў ад 23 да 110.

Вынікі эксперыменту сведчаць аб тым, што аб'яднанне сельскіх і школьных бібліятэк магчыма толькі пры пэўных умовах:

- аб'яднанне мэтазгодна праводзіць на базе сельскай бібліятэкі, якая павінна застацца агульнадаступнай і адначасова забяспечваць
вучэбны працэс;
- аб'яднаная бібліятэка павінна застацца філіялам раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы, у якой зараз маецца пэўны



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эканамічны эфект (дзякуючы арганізацыі цэнтралізаванага камплектавання, апрацоўцы літаратуры, выкарыстанню адзінага фонду і г.д.);

- фінансаванне аб'яднанай бібліятэкі павінна даць магчымасць пры фарміраванні фонду забяспечыць вучэбны і выхаваўчы працэс, пазакласнае чытанне і запыты сельскага насельніцтва.

Яшчэ больш праблем пры аб'яднанні публічных або дзіцячых бібліятэк са школьнымі ў раённых цэнтрах, гарадах і пасёлках гарадскога тыпу. Аб'яднанне дзіцячых бібліятэк са школьнымі, вядома, магчыма. Пры гэтым трэба, аднак, улічваць, што на адну дзіцячую бібліятэку прыходзіцца некалькі школьных (у буйных гарадах - у сярэднім 14). Таму найбольш мэтазгоднай формай аб'яднання ў гарадах, дзе больш трох школ, з'яўляецца стварэнне школьных цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм, у якіх функцыю цэнтральнай бібліятэкі магла б выконваць дзіцячая. Толькі эканоміі гэта не дасць, бо спатрэбіцца дадатковае фінансаванне на стварэнне пры цэнтральнай бібліятэцы аддзела цэнтралізаванага камплектавання і апрацоўкі дакументаў, бібліяграфічнага і метадычнага аддзелаў, а ў школьных бібліятэках буйных школ у адпаведнасці з дзеючымі нарматывамі пры абслугоўванні чытачоў (700 чытачоў на аднаго бібліятэкара) прыйдзецца павялічыць колькасць бібліятэчных работнікаў.

Таму, як сведчаць матэрыялы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і Рэспубліканскай навукова-педагагічнай бібліятэкі, рэарганізацыя бібліятэчных сетак, што склаліся і функцыяніруюць зараз, немэтазгодна, за выключэннем бібліятэк малакамплектных сельскіх школ.

На наш погляд, нельга не пагадзіцца з думкай Прэзідэнта А.Р.Лукашэнкі, што «да пытання аб лёсе бібліятэк неабходна падысці выбіральна, глыбока вывучыўшы мясцовыя ўмовы. Магчыма, трэба прыняць асобную пастанову аб падтрымцы інфраструктуры вёскі. Што тычыцца бібліятэк, іх, безумоўна, неабходна захаваць».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ